Источник: "Наша слова" - 2014-03-19

# Невялікі Скідзель з вялікай гісторыяй

5 сакавіка 2014 года беларускія гісторыкі сабраліся ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі, дзе адбылася прэзентацыя выдання **"Скідзель і яго ваколіцы: жывая гісторыя"**.

Аўтары кнігі - гісторык Сяргей Токць і краязнавец Мікалай Дзелянкоўскі. Кніга пабачыла свет у выдавецтве "Тэхналогія", яе наклад 1000 асобнікаў.

Гэтая навукова-папулярная кніга, напісаная на аснове вывучэння шырокага кола архіўных крыніц, вусных успамінаў і краязнаўчых матэрыялаў. Разглядаецца гісторыя Скідзеля і яго наваколля ад першых згадак у старажытных дакументах XV ст. да сярэдзіны XX стагоддзя. Аўтары імкнуліся максімальна наблізіць чытачоў, найперш скідзельцаў, да падзеяў мінуўшчыны гэтага краю... Таму кніга насычаная імёнамі звычайных людзей, пра якіх ніколі не пісалі ў падручніках і навуковых манаграфіях.

Першыя тры раздзелы - "Эпоха Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай", "У Расійскай імперыі", "У міжваеннай польскай дзяржаве" - напісаныя гісторыкам Сяргеем Токцем, а раздзел "Край змагароў, край паэтаў" і падраздел "Лёс прадпрымальнікаў скідзельскіх" - краязнаўцам Мікалаем Дзелянкоўскім. Абодва аўтары нарадзіліся ў Скідзелі, і гэтая праца ў значнай ступені стала выкананнем маральнага абавязку пред продкамі і землякамі.

Да гэтай імпрэзы супрацоўнікі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў пад кіраўніцтвам Аляксандра Стэфановіча падрыхтавалі выставу "Скідзель: ад мінулага да сучаснасці". На ёй - дакументы сярэдзіны XIX-XXI стст., прысвечаныя гэтай тэматыцы. Гэта манаграфіі, перыядычныя выданні, лістоўкі, мемуарная літаратура. Кнігі серыі гістарычна-дакументальных хронік "Памяць", матэрыялы з фондаў беларускіх архіваў і інш.

У раздзеле "Перыёдыка" - сабраны газеты, якія выходзілі ў 20-х гадах XX ст. і ў часы Вялікай Айчыннай вайны: "Беларуская думка", "Беларускі звон", "Сялянская праўда", "Беларуская Ніва", "Беларуская справа", "Народная справа", "Красное знамя". У іх змешчана багатая інфармацыя, якая адлюстроўвае эканамічнае, палітычнае і культурнае жыццё Скідзеля і яго ваколіц. На некаторых асобніках можна ўбачыць пячаткі і рукапісныя запісы, аўтографы вядомых дзеячаў гісторыі і культуры: беларускіх гісторыкаў І. Краўчанкі, М. Спірыдонава, паэта М. Васілька, пісьменніка Янкі Брыля і іншых. Перад прысутнымі выступілі Зміцер Санько, галоўны рэдактар НВК "Тэхналогія", гісторык Андрэй Кіштымаў і іншыя асобы.




***Аляксей Шалахоўскі,***
*старшыня суполкі "Гісторыя" ТБМ.*

Аляксей Шалахоўскі. Невялікі Скідзель з вялікай гісторыяй